# Культура & art Могилевщина

Информационно-методическое издание

# № 1
# 2021


Редакционный совет:

**О.Ф.Хмельков,**
директор УК «Могилевский областной методический центр народного творчества и культурно-просветительной работы»

**И.В.Балавнева,**
заместитель директора

**В.И.Волчкова,**
**К.В.Башаримова,**
**Е.И.Хмелькова.**



ФЕСТЫВАЛІ, КОНКУРСЫ

З КРЫНІЦ НАРОДНЫХ

БУДНИ КЛУБНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ

УЧЕБА КАДРОВ

ШЧЫРА ВІНШУЕМ!



**212030**
**г.Могилев, ул.Первомайская, 10**
**УК «Могилевский областной методический центр народного творчества и культурно-просветительной работы»**

**http://mogomc.by/**
**e-mail: mogomc@tut.by**

# Содержание

**Валянціна Валчкова.** Вынікі работы клубных устаноў Магілёўскай вобласці за 2020 год.......3

**Светлана Козлова.** Формирование культурных традиций на селе с задействованием имеющегося в регионе культурного потенциала.......10

## Фестывалі, конкурсы

**Аляксандр Кузняцоў.** Абласны агляд-конкурс «У далонях маёй Беларусі».......12

## З крыніц народных

**Дар'я Пархоўчанка.** Абрад Грамніцы ўзнавілі ў Магілёўскім раёне, сцэнарый.......18

**Дайджест.** А у нас сегодня Масленица.......22

**Ольга Нигоматулина.** К теще на блины, сценарий.......30

## Будни клубных учреждений

**Кристина Башаримова.** В объективе - молодые специалисты.......34

**Анна Гурло.** Вместе против наркотиков.......38

## Учеба кадров

**Кристина Башаримова.** Белорусская народная кукла в современной жизни .......40

**Кристина Башаримова.** Душа народа - в песне.......44

## Шчыра віншуем!

**Наталля Шулікава.** Заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму хору народнай песні імя В.Я.Балаханава - 45 год.......46

# Вынікі работы клубных устаноў Магілёўскай вобласці за 2020 год

На 01.01.2021 у клубную сістэму Магілёўскай вобласці ўваходзіла 348 клубных арганізацый.

За 2020 год клубнымі ўстановамі праведзена 96249 культурных мерапрыемстваў пры заданні 92700 мерапрыемстваў. Выкананне мэтавага абласнога прагнознага паказчыка Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016-2020 гады па культурных мерапрыемствах склала 103,8 %.

Не выкананы мэтавы паказчык па колькасці культурных мерапрыемстваў установамі цэнтралізаваных клубных сістэм Бялыніцкага, Быхаўскага, Дрыбінскага, Клімавіцкага, Клічаўскага, Круглянскага, Шклоўскага раёнаў, клубнымі арганізацыямі г.Бабруйска, Дварцом культуры вобласці.

Праведзена 33303 платных культурных мерапрыемстваў, удзельнікамі якіх стала 746886 чалавек, а таксама 300 мерапрыемстваў анлайн. Да ўзроўню 2019 года колькасць наведвальнікаў платных мерапрыемстваў склала 60,9%, да ўзроўню 2015 года – 39,2%.

На ўзровень сярэднеабласнога паказчыка па колькасці наведвання платных мерапрыемстваў у суадносінах 2020 года да 2015 года (39,2%) не выйшлі: установы г.Бабруйска (5,6%), Шклоўскі раён (28,5%), Асіповіцкі раён (30,6%), Магілёўскі гарадскі цэнтр культуры і вольнага часу (36,8%), Кіраўскі раён (39,1%).

Культурнае абслугоўванне жыхароў аддаленых і маланаселеных пунктаў, якія не маюць стацыянарных устаноў культуры, ажыццяўляе 21 аўтаклуб, якімі за 2020 год праведзена звыш 4600 культурных мерапрыемстваў.

Дзеля задавальнення разнастайных інтарэсаў і патрэб насельніцтва пры клубных арганізацыях дзейнічае 2769 клубных фарміраванняў, якія наведваюць 27563 удзельнікі, у тым ліку 1397 дзіцячых фарміраванняў, 13321 удзельнік.

У вобласці 504 творчыя калектывы маюць найменні «народны», «узорны», у тым ліку 16 калектываў – званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». У 2020 годзе 4 калектывы пацвердзілі званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь», 136 – найменні «народны», «узорны», 6 творчым калектывам вобласці прысвоілі найменне «народны», «узорны». Прырост калектываў з найменнямі да 2015 года (471 калектыў) склаў 33 калектывы.

З мэтай падтрымкі аматарскай творчасці на працягу года было праведзена шэраг аглядаў-конкурсаў, фестываляў, якія дэманстравалі іх дасягненні. Гэта:

- міжнародны фестываль-конкурс тэатральнага мастацтва «Тэатральная вясна»;
- міжнародны конкурс інструментальнага мастацтва «Музычная палітра»;
- II Міжнародны фестываль-конкурс мастацтваў «Золотая мечта»;
- міжнародныя дыстанцыйныя конкурсы: конкурс мастацтваў «Яркія агні», фотаконкурс «Поры года», конкурс

## Вынікі работы

дзіцячых анімацыйных мультфільмаў «Залаты Баніфацый», конкурс дзіцячага выяўленчага мастацтва «Мир красоты в красках», вакальны конкурс «Радуга голосов», конкурс ілюстрацый да літаратурных твораў;

- абласны конкурс гарманістаў і выканаўцаў прыпеўкі «Падняпроўскі гармонік»;
- абласны агляд-конкурс калектываў мастацкай творчасці і індывідуальных выканаўцаў XV рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны»;
- абласны конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Дажынкавы вянок».

У рамках рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») была арганізавана работа выставы-кірмашу «Александрыйскі кірмаш», тэматыкай якой стала «Свята нацыянальнага касцюма». На 4-х паралельных радах працавалі розныя экспазіцыйна-тэматычныя падворкі, якія прадстаўлялі ўдзельнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі і горада Мінска, рэгіёнаў Расіі і Украіны. Была арганізавана работа цэнтраў народных рамёстваў, народных гульнявых атракцыёнаў, тэматычнай экспазіцыі ткачых «Спадчына традыцый Падняпроўя». Праведзена ўрачыстае адкрыццё свята, парад-дэфіле рэканструяваных касцюмаў нацыянальных строяў рэгіёнаў Беларусі, Расіі і Украіны. На двух выставачных экспазіцыях былі прадстаўлены работы ўдзельнікаў абласнога конкурсу-выставы «Беларускі народны касцюм Магілёўшчыны», які праводзіўся па дзвюх намінацыях «Лепшы традыцыйны рэканструяваны касцюм» і «Лепшы этнакасцюм». У двух намінацыях прынялі ўдзел каля 40 конкурсных работ – касцюмаў і калекцый.



*Абласны агляд-конкурс калектываў мастацкай творчасці і індывідуальных выканаўцаў XV рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны»*

Па выніках конкурсу журы вызначыла пераможцаў:

намінацыя «Лепшы традыцыйны рэканструяваны касцюм»:

дыплом Гран-пры – Забаўская Ірына Пятроўна, кіраўнік народнага ансамбля народнай песні «Вязанка» Вязьеўскага СДК ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Асіповіцкага раёна»;

дыплом I ступені – Далецкая Алеся Віктараўна, Яцкевіч Таццяна Аляксееўна, раённы Цэнтр культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна»; Сапажкова Таццяна Міхайлаўна, метадыст-майстар раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Клімавіцкага раёна», Семчанка Наталля Віктараўна, настаўнік дэкаратыўна-прыкладной творчасці ДУА «Клімавіцкая дзіцячая школа выяўленчага мастацтва»; Зэлікава Святлана Іванаўна, майстар народных промыслаў (рамёстваў),

Хізанейшвілі Ірына Вітальеўна, кіраўнік народнага аматарскага аб'яднання «Скарбніца» раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Горацкага раёна».

Намінацыя «Лепшы этнакасцюм»:

дыплом Гран-пры – Цімашэнка Святлана Рыгораўна, Барысенка Аляксандра Юр'еўна, народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чараўніцы» УК «Магілёўскі гарадскі цэнтр культуры і вольнага часу», за калекцыю касцюмаў «Купалінка», «Родныя вытокі»;

дыплом I ступені – Кавалёва Таццяна Іванаўна, майстар народных промыслаў (рамёстваў) раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Хоцімскага раёна»; Меснік Соф'я Эдуардаўна, дырэктар раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Глускага раёна».

На высокім арганізацыйным і творчым узроўні былі арганізаваны мерапрыемствы пляцоўкі «Свята з Бялынам» у рамках XXVII Дня беларускага пісьменства ў г.Бялынічы. Для гасцей свята была арганізавана работа тэматычнай пляцоўкі «Вянок беларускіх казак». Пераможцамі конкурсу тэатралізаваных пастановак-прэзентацый тэматычных пляцовак стаў Магілёўскі гарадскі цэнтр культуры і вольнага часу.

У межах Дня беларускага пісьменства праведзены рэгіянальны конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці аб'ёмнай скульптуры «Залаты птах». На конкурсе было прадстаўлена 65 творчых работ, выкананых у тэхніках розных відаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Па выніках конкурсу дыпломам Гран-пры быў узнагароджаны Кудзікаў Сяргей Аляксандравіч, майстар па мастацкім каванні раённага Дома рамёстваў ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Мсціслаўскага раёна» за работу «Ворона Бабы Ягі».

Яшчэ адзін абласны конкурс прайшоў у рамках свята Дня беларускага пісьменства – конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Залатая яблынька», у якім 37 майстроў вобласці ў рэжыме рэальнага часу выраблялі невялікія вырабы па матывах казак. Па выніках конкурсу дыпломамі I ступені былі ўзнагароджаны: Арлоў Аляксандр Васільевіч, народны майстар па ганчарству і кераміцы (Бабруйскі раён), Мачульскі Арцём Аляксандравіч, майстар па кераміцы і ганчарстве (Горацкі раён), Беланожка Галіна Мікалаеўна, майстар па вырабе тэкстыльнай лялькі (г.Магілёў), Давыдаў Віктар Іванавіч, майстар разьбы па дрэве (Касцюковіцкі раён), Якавенка Вячаслаў Мікалаевіч, народны майстар па кераміцы (Крычаўскі раён), Максіменка Максім Валер'евіч, майстар разьбы па дрэве (Крычаўскі раён), Северцава Таццяна Уладзіміраўна, майстар па саломапляценні (Горацкі раён), Быстрова Анжэла Аляксандраўна, майстар па саломапляценні (Быхаўскі раён).

Нягледзячы на стрымальныя фактары пандэміі, у рэгіёнах былі праведзены творчыя праекты ў рэжыме рэальнага часу: рэгіянальны конкурс выканаўцаў патрыятычнай і моладзевай песні, прысвечаны памяці героя Савецкага Саюза Лёні Лорчанкі, раённы фестываль аматарскіх тэатральных калектываў «Бялыніцкая тэатральная восень» (Бялыніцкі раён); рэгіянальны фестываль дзіцячай творчасці «Зоркі над Бесяддзю» (Хоцімскі раён); III раённы конкурс літаратурнай творчасці «Краснаполь-

## Выніkі работы

шчына ў сэрцы маім» (Краснапольскі раён); рэгіянальнае этнасвята «У госці да радзімічаў» (аграгарадок Радамля Чавускага раёна); раённы фестываль народнай творчасці і рамёстваў «Глушанскі хутарок» (п.Глуша, Бабруйскі раён); фестываль «Макавей» (Слаўгарадскі раён); свята-кірмаш «Дзень варэння» (Чэрыкаўскі раён) і іншыя.

Ува ўсіх рэгіёнах вобласці, паранейшаму, застаюцца запатрабаванымі ў арганізацыі сямейнага вольнага часу масавыя гулянні і святы, фальклорнаабрадавыя праграмы, заснаваныя на традыцыях святаў і абрадаў народнага календара: Каляды, Масленіца, Купалле, Сёмуха, Пакрова і іншыя.

З мэтай стварэння ўмоў для развіцця народных мастацкіх рамёстваў у Магілёўскай вобласці дзейнічаюць 17 Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў і Быхаўскі раённы Цэнтр культуры народнай творчасці і рамёстваў, з якіх 5 знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. За 2020 год раённымі Дамамі (Цэнтрамі) рамёстваў праведзена звыш 2600 культурных мерапрыемстваў.




*Рэгіянальнае этнасвята «У госці да радзімічаў», Чавускі раён*



*III раённы конкурс літаратурнай творчасці «Краснапольшчына ў сэрцы маім», Краснапольскі раён*

Упершыню ў снежні мінулага года была праведзена навагодняя выстава-кірмаш «Новы год ідзе па вялікай планеце», у якой прынялі ўдзел спецыялісты Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці вобласці з 16 раёнаў вобласці і г.Магілёва.

Для папулярызацыі народных мастацкіх рамёстваў, розных накірункаў і жанраў дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў рэгіёнах вобласці былі праведзены: V Міжрэгіянальны фестываль-конкурс народнай творчасці «Крычаўскі канёк» (Крычаўскі раён); раённы фестываль дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Саламяны павук» (Быхаўскі раён); рэгіянальны фестываль народных промыслаў і рамёстваў «Краснапольскі глечык», раённы конкурс «Лялька-брэнд Краснапольшчыны», рэгіянальны конкурс «Незабытыя рамёствы» (Краснапольскі раён); раённы фестываль-кірмаш народных рамёстваў «Асіпоўшчына рамесная» (Асіповіцкі раён); штогадовы пленэр па ганчарстве і кераміцы майстроў-керамістаў (Цэнтр рамёстваў п.Глуша Бабруйскага раёна), раённы конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чароўны вулей» (Бабруйскі раён), рэгіянальнае

дыстанцыйнае свята-конкурс «Свята Лялькі» (Круглянскі раён) і іншыя.

Арганізаваны ўдзел 37 майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці вобласці ў рэспубліканскай выставе сучаснага народнага мастацтва «Калядныя ўзоры», дзе Магілёўская вобласць была прадстаўлена асобнай экспазіцыяй.

У абласны банк дадзеных майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці ўваходзіць звыш 400 майстроў і ўмельцаў вобласці. У Беларускі саюз майстроў народных мастацкіх рамёстваў уваходзяць 102 майстры, 21 майстар мае статус «народны майстар».

Для рэалізацыі ўласнай сувенірнай прадукцыі ў раёнах пры дамах, цэнтрах рамёстваў арганізавана работа 3 салонаў-крам, 3 сувенірныя лаўкі ў гандлёвых аб'ектаў, 1 мастацкі салон, 4 установы арганізуюць продаж сувеніраў праз сувенірныя лаўкі пры раённых музеях. Майстры маюць магчымасць прадаваць сваю сувенірную прадукцыю таксама на выставах-кірмашах у рамках культурных падзей, якія праводзяцца на тэрыторыі Магілёўскай вобласці.

У лютым 2020 года элемент нематэрыяльнай спадчыны Магілёўскай вобласці «Мастацкія практыкі саломапляцення Магілёўскай вобласці: г.Магілёў, г.Бабруйск, г.Быхаў, г.Горкі, аграгарадок Кароўчына Дрыбінскага раёна, г.Кіраўск, г.Клічаў, в.Гронаў Чэрыкаўскага раёна» занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. На сёння ў Магілёўскай вобласці 14 аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны занесены ў спіс.

Ва ўмовах сітуацыі, што склалася з пандэміяй удзел у міжнародных конкурсах і фестывалях ажыццяўляўся дыстанцыйна. Усяго творчыя калектывы і майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці вобласці прынялі ўдзел у каля 80 культурных падзеях краін блізкага і далёкага замежжа. За 2020 год за ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх конкурсах, фестывалях (у тым ліку і анлайн) творчыя калектывы і майстры былі адзначаны дыпломамі рознай ступені: Гран-пры – 17, дыплом I ступені – 191, дыплом II ступені – 102, дыплом III ступені – 49.

У 2020 годзе заключаны пагадненні аб культурным супрацоўніцтве паміж установай культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы» і ДАУК «Бранскі абласны метадычны цэнтр «Народная творчасць». У рамках раней заключаных пагадненняў аб культурным супрацоўніцтве адбылася відэаканферэнцыя з удзелам спецыялістаў Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы і Навукова-метадычнага цэнтра павышэння кваліфікацыі ў сферы культуры пры Міністэрстве культуры Азербайджана.

У рамках дамоўленасці з Міжнароднай Асацыяцыяй фалькло-



*Момант падпісання пагаднення аб культурным супрацоўніцтве паміж УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы» і ДАУК «Бранскі абласны метадычны цэнтр «Народная творчасць»*

## Вынікі работы



Дэлегацыя Магілёўскай вобласці ў Румыніі

ру была арганізавана паездка дэлегацыі Магілёўскай вобласці ў Румынію, дзе размяшчаецца дзелавы цэнтр Асацыяцыі, з ліку спецыялістаў цэнтра і дырэктароў раённых, гарадскіх клубных устаноў Магілёўскай вобласці для абмену вопытам па арганізацыі работы клубных устаноў.

Разам з прадстаўнікамі ДКУ ЛО «Дом дружбы Ленинградской области», кіраўнікамі нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў беларускай культуры і бібліятэк Ленінградскай вобласці і Санкт-Пецярбурга Расійскай Федэрацыі праведзены круглы стол, прысвечаны 138-мі гаддзю з дня нараджэння Янкі Купалы ў фармаце відэаканферэнцыі.

Адбыўся сумесны семінар-практыкум па выцінанцы з удзелам спецыялістаў Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў Магілёўскай вобласці, спецыялістаў Новасібірскага цэнтра беларускай культуры, устаноў культуры Новасібірскай вобласці.

Клубнымі арганізацыямі аказваецца звыш 70 відаў культурных паслуг, а таксама звыш 30 відаў дадатковых паслуг. Пазабюджэтная дзейнасць дазваляе клубным арганізацыям паляпшаць матэрыяльна-тэхнічную базу ўстаноў.

Шмат якія раёны рэалізуюць праекты з прыцягненнем замежнай дапамогі. Па выніках рэалізацыі праектаў пры Краснапольскім раённым Доме рамёстваў арганізавана работа ганчарнай майстэрні, закуплены спартыўны інвентар, абсталяваны дзіцячы пакой гульняў і забаваў у моладзевым Цэнтры культуры «Міраж», набыты жаночыя народныя касцюмы. У Быхаўскім Цэнтры культуры, народнай творчасці і рамёстваў набыты швейныя машыны, швейна-вышывальная машынка, ткацкія станкі. Пры Асіповіцкім раённым Цэнтры народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамозе «Мастацтва за інклюзію» была адкрыта інклюзіўная студыя керамікі «Калаўрот».

Усе віды паслуг клубных арганізацый запатрабаваны, але ў рознай ступені, прапануюцца для ўсіх узроставых груп насельніцтва, з улікам асноўных крытэрыяў: стылю жыцця, каштоўнасцяў, захапленняў, асабістых пераваг, інтарэсаў, узросту, узроўню адукацыі, культурнага асяроддзя, прыбыткаў, выдаткаў і інш. Матэрыяльна-тэхнічныя магчымасці клубных арганізацый таксама ўплываюць на попыт паслуг, пэўную абмежаванасць аўдыторыі, што вызначаецца, напрыклад, колькасцю пасадачных месцаў у залах, умяшчальнасцю аўдыторыі і інш.

Найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца масавыя мерапрыемствы (фестывалі, святы, народныя гулянні і інш.), мерапрыемствы рэкрэацыі і забаўляльныя, юбілеі, урачыстасці, індывідуальныя формы з выездам на месца спажыўца, касцюмаваныя балі (выпускны, касцюмаваны, навагодні, маскарад); карнавал, шэсце.

Па-ранейшаму, устойлівым попытам карыстаюцца тэатралізаваныя, абрадавыя мерапрыемствы, заснаваныя на традыцыях святаў і абрадаў народнага календара. У апошнія гады сталі запатрабаванымі сямейна-родавыя святы і абрады: «Імянарачэнне», «Хрысціны», «Сватанне», «Вяселле», «Улазіны». Увесь час ідзе працэс абнаўлення спектра клубных фарміраванняў і іх перапрафіляванне ў залежнасці ад змены інтарэсаў, у 2020 годзе было зарэгістравана 65 новых клубных фарміраванняў.

Асноўнай праблемай развіцця клубнай дзейнасці з'яўляецца несвоечасовае рэагаванне і карэкцыя практык дзейнасці ўстаноў у адпаведнасці з пастаяннай зменай інтарэсаў і запатрабаванняў насельніцтва і задачамі развіцця чалавечага капіталу.

Апроч таго, па-ранейшаму, адной з найскладаных рэсурсавых праблем застаецца нястача кваліфікаваных спецыялістаў – у асобных выпадках назіраецца адставанне прафесійных кампетэнцый клубных работнікаў ад узроўню сучасных тэхналогій культурна-забаўляльнай дзейнасці.

Заданні на 2021 год:

• Ажыццяўляць штомесячны кантроль выканання прагнозных паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гады.

• У Год народнага адзінства ўдзяліць увагу культурна-асветніцкай рабоце, патрыятычнаму выхаванню насельніцтва, асабліва звярнуць увагу на падлеткава-моладзевую аўдыторыю.

• Звярнуць увагу на выніковасць дзейнасці клубных фарміраванняў, для чаго патрэбна часцей практыкаваць правядзенне справаздачных мерапрыемстваў клубных фарміраванняў, клубных устаноў, дзе б дэманстраваліся гэтыя вынікі. Асаблівую ўвагу надаць рабоце клубных фарміраванняў на павелічэнне колькасці іх удзельнікаў.

• Актывізаваць работу па выяўленні і фіксацыі элементаў нематэрыяльнай спадчыны, якая з'яўляецца часткай падмурка, на якім падрастаючае пакаленне фарміруе свае маральныя і духоўныя пачаткі.

• Звярнуць увагу на арганізацыю Дамамі (Цэнтрамі) рамёстваў раённых выстаў, што дэманструюць увесь спектр творчасці майстроў усяго раёна, а таксама на фарміраванне кожнай установай свайго брэндавага раённага мерапрыемства па папулярызацыі творчасці майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці раёна. Пры гэтым задзейнічаць патэнцыял майстроў, якія ўваходзяць у спіс рэгіянальных банкаў дадзеных.

• Акцэнтаваць увагу на ўзбагачэнне зместу традыцыйных фестываляў, святаў, што праводзяцца ў рэгіёнах вобласці на прадмет масавага задзейнічання насельніцтва.

• Паставіць на кантроль абнаўленне рэпертуараў творчых калектываў, што дзейнічаюць пры клубных установах, з той мэтай, каб калектывы былі здольныя фарміраваць канцэртныя праграмы рознай тэматыкі.

• Метадычным службам акцэнтаваць увагу на стварэнне метадычных фондаў раённых цэнтралізаваных клубных сістэм, сельскіх клубных устаноў, у тым ліку і фонда метадычных матэрыялаў для арганізацыі заняткаў клубных фарміраванняў.

***Валянціна Валчкова,***
***начальнік аддзела УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТ і КАР»***

Выніkі работы

# Формирование культурных традиций на селе с задействованием имеющегося в регионе культурного потенциала

Костюковичский район имеет богатую героическую историю, огромный духовный, культурный и интеллектуальный потенциал. Это, в принципе, то, что имеет каждый район, это то, на основе чего мы можем сплотить людей для достижения самой важной цели – воспитание подрастающего поколения в духе гражданственности и патриотизма. И от такого поколения будет зависеть, какое место в будущем займет культурный потенциал района в формировании ценностных ориентиров людей.

Одной из долгосрочных целей в работе учреждений централизованной клубной системы Костюковичского района разработка нового механизма повышения конкурентоспособности клубных учреждений района, задействование исторического и культурного потенциала для создания новых культурных событий в каждом населенном пункте, а также создание системы передачи знаний о локальных народных традициях.

Значимым достижением в этом направлении стал творческий проект по сохранению и развитию традиционной культуры «Традиции Костюковщины – МОЛОДЫМ!» и проект для детской аудитории «Возвращение к истокам». Проекты были направлены на формирование стойкого интереса у подрастающего поколения к культуре во всех ее проявлениях, знакомство и приобщения к местным традициям, обычаям и обрядам.

Реализация проектов началась с 2016 года. За это время было проведено ряд экспедиций и собран богатейший фольклорно-этнографический материал, часть которого легла в основу культурных мероприятий, которые были организованы на базе сельских клубных учреждений и которые со временем могут перейти в разряд культурных традиций:

- ярмарка-обряд «Гусінае свята» на базе Белодубровского сельского Дома культуры;



*Обрядовый праздник «Свята Юр’я»*



*Народный праздник «Луков день»*

- праздник-ярмарка «Ільінскі кірмаш» на базе Новосамотевичского клуба свободного времени;
- праздник «Свята бульбы» в Забычанском сельском клубе;
- праздник «Яблочный Спас» на базе Муравильского сельского Дома культуры;
- народный праздник «Луков день» в Тупичинском сельском Доме культуры;
- обрядовый праздник «Свята Юр'я» в Бороньковском сельском Доме культуры.

Особой популярностью пользуется свадебный обряд «Закіданне зайца», записанный от жительницы д.Муравилье Татьяны Алипченко и восстановленный на базе Муравильского СДК. В 2020 году на базе Тупичинского СДК был разработан свой уникальный сценарий этого свадебного обряда. Он также востребован у населения. В 2021 году планируется проведение обрядового праздника «Сораки» на базе Селецковского СДК.

В рамках проекта «Возвращение к истокам» для детской аудитории разработан цикл познавательных программ, которые знакомят детей с праздниками и обрядами региона, культурными традициями через погружение в активную творческую деятельность. Осваивание материала проходит совместно с носителями фольклора.

В рамках проекта «Возвращение к истокам» на базе сельских клубных учреждений оформлены тематические уголки «Беларуская хатка». На базе Шарейковского СДК разработана интерактивная программа «Интерактивная белорусская хатка» для практического ознакомления детей и подростков с предметами и условиями быта белорусских деревень.

Массовые праздники, построенные на местном самобытном материале, на основе авторских сценариев, привнесли в культурную жизнь нашего района свою изюминку – это яркие образы, ни на что не похожая режиссура, местный колорит.

***Светлана Козлова, директор ГУК «Централизованная клубная система Костюковичского района»***




*Праздник «Свята бульбы»*



*Ярмарка-обряд «Гусінае свята»*

Фестывалі, канкурсы

# Абласны агляд-конкурс «У далонях маёй Беларусі»



*Пераможцы абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі»*

Абласны агляд-конкурс аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі» праходзіць з 2011 года адзін раз у два гады. Арганізатарам агляду-конкурсу з'яўляецца ўстанова культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы». Асноўныя мэты, якія ставяць арганізатары – гэта захаванне тэатральных традыцый Магілёўскай вобласці, падтрымка і развіццё тэатральнага мастацтва ва ўсіх яго разнавіднасцях, а таксама выяўленне новых творчых тэатральных калектываў і выканаўцаў.

У лютым-сакавіку 2021 года прайшоў чарговы агляд-конкурс «У далонях маёй Беларусі». У склад журы ўвайшлі: А.Ф.Хмялькоў, дырэктар УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТіКАР», старшыня Рэспубліканскага савета па пытанням клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, член рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па рабоце з непрафесійнымі (аматарскімі) калектывамі мастацкай творчасці Магілёўскай вобласці, старшыня журы; І.В.Балаўнёва, намеснік дырэктара УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТіКАР», член рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па рабоце з непрафесійнымі (аматарскімі) калектывамі мастацкай творчасці Магілёўскай вобласці; Зінаіда Іванаўна Білык, галоўны рэжысёр УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр

НТіКАР»; Л.Д.Янчыцкая, метадыст па тэатральным мастацтве УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТіКАР», член рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па рабоце з непрафесійнымі (аматарскімі) калектывамі мастацкай творчасці Магілёўскай вобласці; А.П.Кузняцоў, метадыст УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТіКАР», член рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па рабоце з непрафесійнымі (аматарскімі) калектывамі мастацкай творчасці Магілёўскай вобласці.

Конкурс праходзіў у два этапы. На першым этапе журы выязджала на занальныя прагляды конкурсных работ аматарскіх тэатральных калектываў у гг.Бабруйск, Магілёў і Чэрыкаў. Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел больш за дваццаць разнажанравых аматарскіх тэатральных калектываў, студый і тэатраў мініяцюр, што дзейнічаюць на базе ўстаноў культуры Магілёўскага рэгіёна. Тэматыка конкурсных работ сёлета была разнастайнай. Увазе журы былі пададзены ўрыўкі са спектакляў на ваенную тэматыку, дзіцячыя казкі, спектаклі на пабытовыя тэмы, а таксама літаратурныя кампазіцыі. Усе спектаклі праходзілі на беларускай мове, гэта адно з умоў агляду-конкурсу.



*І.І.Ткачоў, вядучы фінальнага мерапрыемства агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі»*

Другі этап агляду-конкурсу «У далонях маёй Беларусі» прайшоў 19 сакавіка ў горадзе Магілёве. Вядучым фінальнага мерапрыемства стаў артыст народнага тэатра Краснапольскага раённага Цэнтра культуры Іван Іванавіч Ткачоў, менавіта ён заваяваў Гран-пры Міжнароднага фестывалю-конкурсу тэатральнага мастацтва «Тэатральная вясна». За яскравую і прафесійную работу быў уручаны Падзячны ліст ад Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.



*Удзельнікі фінальнага мерапрыемства агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў «У далонях маёй Беларусі»*

## Фестывалі, конкурсы

На фінальным мерапрыемстве свае работы паказалі лепшыя аматарскія тэатральныя калектывы вобласці. У фінале прынялі ўдзел 10 лепшых аматарскіх тэатральных калектываў.

Кульмінацыйным момантам конкурсу стала ўзнагароджанне калектываў.

Вышэйшую ўзнагароду конкурсу – дыплом Гран-пры атрымаў тэатр чытальнікаў «Вытокі» ДУА Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў» г.Магілёва за літаратурна-пластычную кампазіцыю па паэме А.Казекі «Марыйка», рэжысёр А.Ерашук. У аснову твора ляглі ўспаміны маці паэта і рэальныя трагічныя падзеі, што адбыліся падчас Вялікай Айчыннай вайны. Спектакль атрымаўся яркім і насычаным. Прагляदаліся цікавыя рэжысёрскія хады. Прафесійна падабрана музычнае і мастацкае афармленне спектакля. Валоданне артыстамі паэтычным словам



*Тэатр чытальнікаў «Вытокі»
ДУА Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў»,
г. Магілёў
літаратурна-пластычную кампазіцыю па паэме
А.Казекі «Марыйка»*

у спалучэнні з яркай харэаграфіяй, пластычнай выразнасцю ўздзейнічала на гледача і пакінула моцнае незабыўнае ўражанне. Літаратурна-пластычная кампазіцыя, у выкананні навучэнцаў тэатральнага аддзялення стала пранікнёным творчым заклікам да кахання, міру і стварэння.



*Тэатр чытальнікаў «Вытокі»
ДУА Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў»,
г. Магілёў
літаратурна-тэатралізаваная кампазіцыя па
аповесці М.Гарэцкага «Цёмны лес»*

Дыпломам I степені быў узнагароджаны тэатр чытальнікаў «Вытокі» ДУА Магілёўскі дзяржаўны коледж мастацтваў» г. Магілёва за літаратурна-тэатралізаваную кампазіцыю па аповесці М.Гарэцкага «Цёмны лес», рэжысёр З.Білык. Няпростая па форме літаратурна-тэатралізаваная кампазіцыя з першых хвілін не абяцала забаўкі, а наладжвала гледача на сур'ёзнасць. У кампазіцыі пададзены лес у чатырох порах года. Цікавую рэжысёрскую знаходку прадставіла ўвазе гледача рэжысёр. Яна скарыстала шумавыя прылады, голас артыстаў у перадачы гукавых эфектаў лесу і яго насельнікаў.



*Народны тэатр чытальнікаў «Сюжэт» раённага Цэнтра культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Магілёўскага раёна»*

Дыпломам II ступені быў удастоены народны тэатр чытальнікаў «Сюжэт» раённага Цэнтра культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Магілёўскага раёна» за літаратурна-музычную кампазіцыю па аповесці Я.Коласа «Хмарка», рэжысёр А.Феактыстава. Асноўнай ідэяй рэжысёра было паказаць, што не трэба шукаць шчасце, недзе далёка на чужыне, калі яно побач там, дзе ты нарадзіўся. Сваёй работай рэжысёр падняў сур'ёзную праблематыку. Дзеянне кампазіцыі пачынаецца з вакзала, пасажыры імкнуцца з'ехаць са сваёй зямлі, што б знайсці лепшае жыццё. Артыстка, якая іграла ролю «хмаркі», цудоўна яе выканала.

Дыпломам III ступені быў узнагароджаны народны тэатр УК «Палац культуры вобласці» г. Магілёва, які прадставіў спектакль па паэме М.Гусоўскага «Песня пра зубра», рэжысёр А.Кускова. Цікавы гістарычны сюжэт спектакля. Рэжысёр скарыстаў яркія і прадуманыя касцюмы таго часу. У пастаноўцы задзейнічаны ўсе артысты, якія ствараюць дынамічныя і масавыя сцэны, што прыўносяць у спектакль адменную відовішчнасць. Артысты ўсе каларытныя, у пастаноўцы няма галоўных і другарадных роляў. Спектакль больш для тых, хто хоча падумаць і пашукаць сэнс нават там, дзе яго няма.

Спецыяльнымі дыпломамі былі ўзнагароджаны: у намінацыі «Лепшая рэжысёрская пастаноўка» – народны тэатр ДУК «Палац мастацтваў г.Бабруйска» за спектакль «Бор-



*Народны тэатр УК «Палац культуры вобласці» г.Магілёва*



*Народны тэатр ДУК «Палац мастацтваў г.Бабруйска»*

ка», рэжысёр У.Бабініч, а таксама народны тэатр эстрадных мініяцюр «Штрых» раённага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Шклоўскага раёна» за спектакль па п'есе В.Ткачова «Лялькі», рэжысёр І.Дзегцяронак. Журы не змагло вызначыцца паміж двума пастаноўкамі, таму вырашыла ўзнагародзіць два калектывы.

Дыпломам у намінацыі «Лепшы дзіцячы спектакль» быў узнагароджаны ўзорны тэатр лялек «Паўлінка» Редкарожскага сельскага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Бабруйскага раёна» за спектакль па матывах беларускіх народных казак «Як коцік матулю шукаў», рэжысёр А.Кірыенка. У спектаклі задзейнічана вялікая колькасць дзяцей. Вельмі цікавай была дзіцячая пастаноўка і маленькія акцёры, якія граючы ў ёй, добра працавалі з лялькамі.

Дыплом у намінацыі «Лепшы акцёрскі ансамбль» быў уручаны творчай групе аўтаклуба ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Кіраўскага раёна» за спектакль па п'есе А.Дударава «Не пакідай мяне», рэжысёр В.Альховік. Рэжысёр добра падабраў акцёрскі ансамбль, які змог з дакладнасцю данесці да гледача ўсе жахі вайны.

У намінацыі «Лепшая мужчынская роля» быў вызначаны Яўген Аношка, творчая група ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Слаўгарадскага раёна» за спектакль па п'есе Э.Піжэнка



*Народны тэатр эстрадных мініяцюр «Штрых» раённага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Шклоўскага раёна»*



*Узорны тэатр лялек «Паўлінка» Редкарожскага сельскага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Бабруйскага раёна»*



*Творчая група аўтаклуба ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Кіраўскага раёна»*



*Яўген Аношка (першы злева) і ўдзельнікі творчай групы ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Слаўгарадскага раёна»*



*Таліна Балматкова, тэатральны гурток «Люстэрка» Язерскага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чэрыкаўскага раёна»*



*Народны тэатр «Шалом» ГА «Магілёўская яўрэйская грамада»*

«За паўгадзіны да вясны», рэжысёр Н.Купрэенка. П'еса была перакладзена на беларускую мову, у якой падымалася тэма вайны. Дзеянне разгортваецца ў вайсковым лазарэце. За добра згуляную ролю параненага салдата Івана, акцёр атрымаў заслужаную ўзнагароду.

У намінацыі «Лепшая жаночая роля» дыплом уручаны Таліне Балматковай, тэатральны гурток «Люстэрка» Язерскага Дома культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чэрыкаўскага раёна», яна ж з'яўляецца кіраўніком гуртка. Артыстка атрымала ўзнагароду, за ярка сыграную ролю вясковай кабеты.

Спецыяльным дыпломам «За высокі ўнёсак у развіццё тэатральнага мастацтва» журы ўзнагародзіла народны тэатр «Шалом» грамадскага аб'яднання «Магілёўская яўрэйская грамада», які прадставіў увазе літаратурна-музычную кампазіцыю аўтара Л.Афрэмавай «І памяць сэрца гаворыць», рэжысёр М.Джаліашвілі. Сцэнарый кампазіцыі быў заснаваны на рэальных падзеях.

Іншыя ўдзельнікі агляду-конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі за ўдзел.

Наступны абласны агляд-конкурс «У далонях маёй Беларусі» адбудзецца ў 2023 годзе.

***Аляксандр Кузняцоў,***
***метадыст установы культуры***
***«Магілёўскі абласны метадычны цэнтр НТіКАР»***

З крыніц народных

# Абрад Грамніцы ўзнавілі ў Магілёўскім раёне

У дзяржаўнай установе культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Магілёўскага раёна» вялікая ўвага надаецца захаванню і адраджэнню народных абрадаў.

Сёлета ў вёсцы Грыбаны ўпершыню цалкам узнавілі аўтэнтычнае славянскае свята Грамніцы. Гэты дзень у народным календары азначае сустрэчу вясны з зімой.

Абрад Грамніцы незаслужана забыты. Для яго ўзнаўлення і адраджэння загадчык аддзела метадычнай работы Феактыстава А.А., метадыст па народнай творчасці Крывашчапава А.А., хормайстар раённага Цэнтра культуры Якаўлева І.В. арганізавалі экспедыцыю, падчас якой быў сабраны, сярод жыхароў аг.Масток, в.Грыбаны, в.Макаранцы, в.Колы, матэрыял па дадзенай тэматыцы.

Актыўны ўдзел у рэканструкцыі абраду прымалі ўдзельнікі ансамбля народнай песні «Мостовчанка» Мастоцкага сельскага клуба, кіраўнік Букініч Мікалай Васільевіч, ансамбль народнай песні «Лянок» Грыбаноўскага сельскага Дома культуры, кіраўнік Бондарава Алена Мікалаеўна.

Па старажытным звычаі ў гэты дзень кабеты робяць свечку-абярэг з воску, а мужчыны запальваюць сакральны агонь.















На працягу года кабеты павінны збіраць свечкавыя апалкі. А напярэдадні Грамніц яны праводзяць абрад у хаце гаспадыні, якая захоўвала ў сябе свечку-абярэг увесь мінулы год. З апалкаў яны робяць новую вялікую свечку-абярэг ад злых духаў на ўвесь наступны год.

Асаблівае месца ў гэтым абрадзе заўсёды адводзілася мужчынам. Яны павінны былі з дапамогай крэсіва і лёну запаліць сакральнае вогнішча – знак ачышчэння і абароны. Ад яго запальвалася спачатку грамнічная свечка, а пасля свечкі ўсіх, хто браў удзел у абрадзе.

Нашы продкі верылі, што грамнічная свечка дапамагае аднадзіць злых духаў ад жывёлы і бараніць хату ад бур. Таксама свечку перадавалі ў вёсцы тым гаспадарам, у якіх праблемы з жывёлай. Лічылася, што, калі абысці адрына з запаленай свечкай, жывёлы будуць пад абаронай, а ўсе беды пройдуць бокам.

Па традыцыі заканчаўся абрад бяседай у хаце гаспадыні, дзе наступны год будзе захоўвацца абярэг.

***Дар'я Пархоўчанка,***
***метадыст 1 катэгорыі***
***ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Магілёўскага раёна»,***
***Фотаздымкі – Марыам Табагары,***
***фотакарэспандэнт газеты «Магілёўскія ведамасці»***

З крыніц народных

# «Грамнічная свяча”

### сцэнарый свята

*На дварэ мужчыны запаліваюць вогнішча.*

**Мужчына:** Шаноўны Пярун, дай нам сваю іскрыцу, каб мы пачалі зваць Грамаўніцу.

**Разам:** Гары-гары ясна, каб жыццё не згасла!

**Мужчына:** А вонь ужо і жанчыны да нас ідуць.

*Да вогнішча падыходзяць жанчыны і дзяўчаты з песняй «Благаславенне”.*

**Жанчына:** Прывітанне хлопцы!
Сёння у нас грамніцы,
зімы палавіцы
Няхай лета ў акенца пастукае,
Громам ясным у небе пагрукае,
Свячу грамнічную,
абярэжную запальвае,
Духаў злых адважвае.
Багіню Грамаўніцу шануем,
разам збіраемся і святкуем.

**Жанчына:** Мы ж усю ноч не спалі, свячу абярэжную рыхтавалі

**Жанчына 2:** Все кавалачкі воску прыляпілі.

**Жанчына 3:** Вось якую Грамаўніцу зрабілі.

**Жанчына 4:** Ды ў царкве асвяцілі.

**Мужчына:** Зараз святым вогнішчам апалілі, Бога нашага праславілі.

**Мужчына:**
Ах ты наша Грамаўніца,
ад холада і сцюжы заступніца,
Дай нам праз святое вогнішча
моц і сілу!
Запалі свячу грамнічную,
выкажы згоду вялічную.

*Запальваецца вялікая Грамнічная свяча з якой мужчына абыходзіць вакол кожнага чалавека і запальвае ім свечачкі.*

**Мужчына:** І вас даражэнькія, агнем зберагаю, свечачкі вашы запальваю.

*Разам спяваюць «Зіма з Летам сустракаюцца».*

1. Зіма з летам сустракалася
Лета ў зімачкі пыталася У-у

2. Чаму Зіма на гару не ідзеш?
Ці ты свайго канца не ждеш? У-у

3. На вуліцу ўжо дзеўкі ідуць
Вясну-красну з леційкам завуць
У-у

4. Ідзі Зіма з кастылёчкамі
Прыйдзі Вясна ды з кіёчкамі

5. Прыйдзі Вясна ды с цвяточкамі
Прыйдзі Лецейка з вяночкамі

*Пасля песні жанчыны і дзяўчаты тушаць свечы аб снег і завярнуўшы ў хустачку хаваюць запазуху.*

**Жанчына:** Гадочак святая Грамаўніца ў мяне пражывала, жывёлу маю зберагала, зараз перададзім яе Мікалаеўне, хай і ў яе ў гэтым годзе жывёла будзе ў прыплодзе.

*Усе ідуць да хаты Мікалаўны.*

**Жанчына:**

Грамніцы разам сустракаем,
Песні добрыя спяваем,
Злых духаў адганяем,
Дабрабыту ўсім жадаем.

*Сяляне перадаюць Грамнічную свячу – Грамаўніцу, новай гаспадыні, у якой былі праблемы з жывёлай.*

## Тэксты песень

### «Благаслаўленне”

Благаславіце дай добрыя людзі
На Стрэчынння нам гуляці,
Ды грамніцы асвячаці.

### «Стрэчанне”

А у нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне.
Зіма з летам стрэлася, стрэлася.
Лета зіму піхнула, піхнула.
Зіма ножку звіхнула, звіхнула.
Яна пайшла плачучы, плачучы.
Лета пайшло скачучы, скачучы.



# А у нас сегодня Масленица!

«Где блины, тут и мы; где с маслом каша – тут и место наше» – один из самых веселых и дружелюбных праздников в году, который отмечают семь дней – Масленица. Неделю люди празднуют, кушают блины, провожают холода, встречая теплое время года.

Масленица – это праздник, который отмечали еще наши предки-славяне. В этом году Масленица пришла на белорусскую землю 8 марта и продлилась до 14 числа. Каждый день проходили особые ритуалы и угощения, но главным атрибутом праздничного стола были и остаются блины. Они символизировали у наших предков солнце – такие же круглые, горячие и румяные. А если весной солнце будет вдоволь – урожай будет богатым, столы – полными, а семьи – счастливыми.

На Могилевщине во всех клубных учреждениях прошли тематические фольклорные мероприятия.

## А мы Масленицу встречали!

7 марта Краснопольский Центр культуры открыл масленичную неделю на городской площади г.п.Краснополья. Шумно и ярко прошло настоящее народное гуляние «А мы масленицу встречали!». Веселые зазывалы-скоморохи поднимали людям настроение, выступление народных коллективов «Шчадрэц» и «Субботея» радовали своими зажигательными песнями, от которых многие пускались в пляс. Так же было множество различных конкурсов, в которых соревновались дети и взрослые в силе, ловкости, скорости, сноровке.



Всем Краснопольчанам, было обеспечено хорошее настроение. Праздник удался на славу: веселый, насыщенный, многолюдный. Все от мала до велика зарядились сполна позитивом и яркими эмоциями. Особую атмосферу празднику придавали торговые палатки с сувенирной продукцией или так называемый «Город мастеров».



Жители агрогородков Турья, Горы, Яновка закрыли масленичную неделю 13-14 марта. Большое количество людей собрались около сельских учреждений культуры. Организаторы праздника приложили немало усилий, чтобы проводы зимы прошли на славу. В самом начале праздника выступили ансамбли народной песни «Вербіца» Турьевского СДК, «Яначкі» Яновского СДК, «Пой душа» Горского СДК и солисты сельских учреждений культуры.

Закончились празднования традиционно и по всем канонам – сжиганием чучела Масленицы.

***В.В.Ткачева,***
***заведующий культурно-массовым отделом ГУК «Централизованная клубная система Краснопольского района»***

## Масленица в Кричеве

13 марта на площадке в микрорайоне Комсомольский в Кричеве отметили фольклорный праздник «Масленица». Работали торговые ряды, выставочные площадки развернули учреждения образования города и района, мастера народного творчества.



Сценическое действо открыли веселые скоморохи, которые активно взаимодействовали с публикой, вовлекая зрителей в подвижные игры, танцы и хороводы, среди которых был и давно полюбившийся кричевлянам танец-хоровод «Маразуля». По традиции масленичных гуляний кульминацией праздника стало сожжение чучела Масленицы, чтобы вместе с ним в обрядовом огне

сгорела зима и поскорее согрелась земля, чтобы весна вступила в свои права.

Традиционная праздничная забава Масленичный столб также пришлась по душе кричевлянам, и абсолютным победителем в этой забаве выступил Иван Побелустик, который с первой попытки взобрался на самый верх и стал обладателем приза.

Праздничная программа продолжилась концертной программой, с конкурсами и танцами, теплым дру-



жеским общением и, конечно же, хорошим настроением, не оставив никого из зрителей равнодушными!

*О.В.Скороходова,*
*режиссер РЦК ГУК «Централизованная клубная система Кричевского района»*

## Вясёлая Масленіца адбылася ў Шклове!

13 сакавіка, на плошчы каля раённага Дома культуры было асабліва шумна і шматлюдна – праходзіла народнае свята «Вясёлая Масленіца».

З самай раніцы на плошчы ўзводзіліся гандлёвыя рады, свята ўрачыста адкрылася, вабячы ўсіх шклаўчан вясёлымі песнямі, цікавымі гульнямі ды смачнымі масленічнымі пачастункамі.

Насычаная музычная праграма свята складалася з выступленняў народнага ансамбля народнай песні і музыкі «Бліскавіца»раённага Дома культуры, вакальных ансамблей «Дзяўчаты»Гавядскага сельскага Дома культуры і «Чарняначка»




Чарнянскага сельскага клуба, Тамары Лёгкай салісткі з Гарадзецкага сельскага Дома культуры, Віктара Шмагурова з Слабадскога сельскага клуба-бібліятэкі, Веры Азарэвіч з Александрыйскага Цэнтра культуры і вольнага часу і г.д.






Таксама было арганізавана шмат цікавых масленічных гульнях: «Трапны стралок”, «Рыбак і рыбкі”, перацягванне каната, «Лазня”, бой падушкамі на бервяне і г.д. А самыя моцныя і спрытныя хлапчукі мелі магчымасць паспрабаваць залезці на масленічны столб за падарункамі.

На свяце можна было сустрэць латочніц і набыць у іх яркія стужачкі, якія трэба было павязаць на пудзіла Масленіцы, калі хочаш, каб усе твае крыўда і смутак згарэлі разам з ёй. Дарэчы, спальванне пудзіла Масленіцы стала кульмінацыяй свята, сімвалам сустрэчы сапраўднай вясны.

***С.Л. Буевіч,***
***метадыст па рабоце з дзецьмі і падлеткамі***
***ДУК «ЦКС Шклоўскага раёна”***
***Фота аўтара і А.Рыбакова, фотакарэспандэнт раённай газеты «Ударны фронт”***

## Масленицу встречай!

В агрогородке Полыковичи Могилевского района собрались участники любительских коллективов со всего района. Это стало уже доброй традицией каждый год устраивать Масленицу, придерживаясь традиций предков. Каждый день тематиеский.

– В первый день Масленицы начинали готовиться к празднику – этот день называется «Встреча». Сооружали различные сцены, качели и снежные горки. В этот же день собирали из подручных средств чучело Масленицы – символ уходящей зимы, – рассказала культорганизатор Полыковичского сельского Дома культуры Татьяна Жигалина. Главное угоще-



ние всей недели – блины да оладьи. И у каждой женщины свой рецепт блинов был, который они передавали из поколения в поколения и берегли, как настоящую святыню.

– С понедельника начинали готовить и блины. По традиции, первый блин всегда отдавали предкам – его делили на несколько частей и раскладывали на окна. Чтобы предки могли в гости заглянуть, угоститься лакомством и пожелать семье счастья и добра.

Второй день масленичной недели носит название «Заигрыш». В этот день принято проводить сватовство и смотрины. Третий день Масленицы отличается от двух предыдущих богатым столом. Ведь теща зятя в гости ждет.

С четверга уже начинались большие гуляния, всю работу оставляли – этот день называется «Разгул». Катались на санях, с горок, играли в снежки и штурмовали снежные замки. Ходили в гости. Пятницу называ-





ют «Тещины вечерки». По традиции, в этот день теща к зятю с ответным визитом приходила в гости. Субботу –«Золовкины посиделки», молодые хозяйки в свой дом родственников мужа приглашали. В последний день Масленицы – «Прощеное воскресенье», принято прощения у всех просить.

